# Выхаванне грамадзяніна і патрыёта пачынаецца з сям'і

( з вопыту работы )

Ж.І.Мохань, намеснік дырэктара
па вучэбна-выхаваўчай рабоце
ДУА "Цырынскі вучэбна-педагагічны
комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа"

У сучасных умовах, калі адбываюцца глыбокія змены ў жыцці грамадства, адным з цэнтральных накірункаў работы з падрастаючым пакаленнем становіцца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне. Бясспрэчны той факт, што аснова выхавання чалавека закладваецца ў сям'і. Патрыятычнае выхаванне, цікавасць да духоўнага пачатку нашага жыцця таксама павінны пачынацца ў сям'і. Дзеці павінны ведаць гісторыю сваёй краіны. Без мінулага няма будучага. Дзеці вучацца ў першую чаргу на прыкладзе сваіх бацькоў і затым сямейныя традыцыі праносяць у сваё жыццё, у сваю сям'ю. Пагэтаму бацькі павінны імкнуцца выклікаць у дзяцей пачуццё падзякі да старэйшага пакалення, якое заваявала незалежнасць нашай Радзімы.

Цяпер, у перыяд нестабільнасці ў грамадстве, узнікае неабходнасць вярнуцца да лепшых традыцый нашага народа, да яго векавых каранёў, да такіх вечных паняццяў, як род, сваяцтва, Радзіма. Пачуццё патрыятызму шматгранна па сваім змесце: гэта і пачуццё глыбокай, духоўнай прыхільнасці да сям'і, дому, любоў да родных мясцін, і гонар за свой народ, талерантнае стаўленне да іншых людзей, адчуванне непарыўнасці з навакольным, жаданне захаваць, прымножыць багацце сваёй краіны.

Быць патрыётам - значыць адчуваць сябе неад'емнай часткай Айчыны, Радзімы, Бацькаўшчыны ... У каранях гэтых слоў блізкія, дарагія кожнаму вобразы: маці і бацька, родныя мясціны, гаворка, музыка, гісторыя.

Выхаванне пачуцця патрыятызму адыгрывае велізарную ролю ў станаўленні асобы дзіцяці. Гэты працэс складаны і працяглы. «Кожнае дзіця нараджаецца добрым і для добрага жыцця», таму тое, якія маральныя якасці закладваюцца ў дзіцяці, залежыць, перш за ўсё, ад бацькоў і навакольных яго дарослых, ад таго, як яны яго выхоўваюць, якімі ўражаннямі ўзбагацяць.

Поспех патрыятычнага выхавання дзяцей, шмат у чым залежыць ад бацькоў, ад сям'і, ад той атмасферы, якая пануе дома. Перад намі, дарослымі, стаіць нялёгкая задача - данесці ўсю глыбіню паняцця "грамадзянін Айчыны» да маленькага Чалавека, закласці яму любоў да Радзімы. У дзіцяці-дашкольніка Радзіма пачынаецца з сям'і. Калі дзіця цягнецца ручкамі да маці і бацьку - ён адчувае іх сілу, цяпло, пяшчоту, любоў і сваю абароненасць. Менавіта з гэтых адчуванняў пачынаецца яго любоў да сваёй сям'і, роднай хаты, сваёй маленькай радзімы.

Сям'я выступае ў якасці гаранту дабрабыту краіны.Менавіта ў сям'і закладваюцца духоўна-каштоўнасныя арыенціры, зыходзячы з якіх падлетак у далейшым успрымае, перапрацоўвае, засвойвае або не прымае інфармацыю ў якасці кіраўніцтва да дзеяння. У сваю чаргу школа заклікана ствараць адпаведныя педагагічныя ўмовы для падрыхтоўкі вучняў да сямейнага жыцця,

фарміравання каштоўнасных адносін да шлюбу, культуры ўзаемаадносін паміж мужчынам і жанчынай, адказных паводзін у грамадстве. Практыка паказвае, што эфектыўнасці работы ў гэтым кірунку значна спрыяе супрацоўніцтва школы і сям'і з Беларускай Праваслаўнай царквою. Узаемадзеянне ўстановы адукацыі з сям'ёю будуецца на прынцыпах адказнасці і даверу, гуманізму і павагі асобы, дыферэнцыяцыі і пераемнасці, хрысціянскіх норм маральнасці паводзін.

Сярод прыярытэтных напрамкаў нашай дзейнасці — інтэграцыя пытанняў сямейнага выхавання ў змест вучэбных прадметаў і факультатыўных заняткаў, сямейна-маральнае выхаванне праз пазакласную дзейнасць. Выхоўваючая сіла сям'і ў нас спрадвеку трымалася на любові, даверы, цярпенні і ўзаемнай дапамозе, традыцыях шанавання старэйшых і педагогіцы. Веды і асабісты прыклад бацькоў былі гарантыяй здаровага выхавання дзяцей. Сучаснае грамадства мае вялікую патрэбу ў такім вопыце. У школьнай практыцы ў яго асэнсаванні і засваенні нам дапамагаюць літаратурная спадчына і культурныя традыцыі. У рамках вучэбнай дзейнасці варта адзначыць урокі беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, грамадазнаўства, гісторыі Беларусі, курса "Чалавек і свет" у пачатковых класах. Матэрыял гэтых прадметаў фарміруе ў дзяцей уяўленні пра сям'ю, сямейныя адносіны і хрысціянскія каштоўнасці. На ўроках грамадазнаўства, біялогіі, падчас вывучэння курса "Чалавек і свет" вучні разглядаюць такія пытанні, як прававыя асновы сямейна-шлюбных адносін, інфляцыя і сямейная эканоміка, шлюб і сям'я, сям'я і здаровы лад жыцця, рэпрадуктыўнае здароўе насельніцтва і нацыянальная бяспека Беларусі. На ўроках літаратуры, гісторыі праводзяцца гутаркі аб сямейным выхаванні, традыцыях, разглядаецца адвечная праблема бацькоў і дзяцей, неабходнасці паразумення і ўзаемадапамогі. Урокі працоўнага навучання дапамагаюць падрыхтавацца да самастойнага вядзення хатняй гаспадаркі. Акрамя таго, мы арганізоўваем конкурсы, інфармацыйныя і класныя гадзіны, відэазалы, круглыя сталы, віктарыны, сумесныя з бацькамі мерапрыемствы. Традыцыйнымі для школы з'яўляюцца спартыўныя мерапрыемствы "Тата, мама, я — спартыўная сям'я", "Разам — лепш", сумесныя паходы па родным краі, экскурсіі, святочныя праграмы.





Фарміраванне ў дзяцей і падлеткаў адэкватных уяўленняў аб сямейных каштоўнасцях і значэнні сямейных традыцый садзейнічае выхаванню стойкіх маральных перакананняў, стымулюе паважлівае стаўленне да свайго роду і да саміх сябе. Праведзенае даследаванне па вывучэнні ўяўленняў старшакласнікаў пра сямейныя каштоўнасці і традыцыі паказала, што да сямейных каштоўнасцей вучні аднеслі паразуменне, павагу, любоў, сумесную радасць, узаемадапамогу, любоў бацькоў адно да аднаго, гармонію, здароўе членаў сям'і, дзяцей. Але ёсць вучні, якія не ведаюць дакладна, што такое сямейныя каштоўнасці. Пагэтаму ўвага класных кіраўнікоў акцэнтавана на садзейнічанне бацькам у павышэнні культуры сямейнага выхавання, навучанні старшакласнікаў прынцыпам партнёрскага ўзаемадзеяння як крыніцы сямейнай самасвядомасці, інфармаванні бацькоў аб магчымасцях сацыяльна-педагагічнай службы ўстановы адукацыі, арганізацыі сумесна з бацькамі тэматычных мерапрыемстваў, аказанні вучнямі іх бацькам дапамогі ў арганізацыі сямейнага вольнага часу, выхаванні пачуцця гонару за сваю сям'ю. Выхаваўчыя мерапрыемствы арганізоўваюцца па тэмах праектнай дзейнасці ў адпаведнасці з хрысціянскім календаром.

У рамках работы сямейнага клуба "Свет душы" рэалізуюцца наступныя праекты: у верасні — кастрычніку -"Пад шатамі духоўнасці" і "Дню маці і святу Пакрова Прасвятой Багародзіцы прысвячаецца". Іх кульмінацыяй штогод становіцца Тыдзень маці, у рамках якога праводзяцца такія мерапрыемствы, як пакроўская восеньская выстава, канцэртная праграма "Трыжды святое слова "мама", выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Залатыя рукі маёй матулі". На працягу навучальнага года ажыццяўляецца праект "Дарога да храма", у студзені — праект "Калядныя сустрэчы", прысвечаны святкаванню Нараджэння Хрыстова. Асаблівай увагі заслугоўваюць калядныя бацькоўскія сходы, якія сталі добрай традыцыяй. На люты выпадаюць асноўныя

мерапрыемствы праекта “Грамадзянскі абавязак на варце Айчыны”, на сакавік — праекта “Табе матуля, прысвячаем!”, на красавік — праекта “У будучыню — з дабрынёй у сэрцы!”. Май праходзіць пад знакам праекта “Гісторыя маёй сям’і ў гісторыі маёй краіны”, прысвечанага Вялікай Перамозе.











У цэлым работа накіравана на выхаванне такіх паняццяў, як цнатлівасць, моцная сям’я, адказнае бацькоўства, павага да бацькоў. Пытанням сямейнага

выхавання прысвячаюцца тэматычныя інфармацыйныя гадзіны, урокі маральнасці, сямейныя гасцёўні і літаратурна-музычная гасцёўня “Пад шатамі духоўнасці”, заняткі ў майстэрнях дэкаратыўна-прыкладной і мастацкай творчасці, відэасалоны для вучняў, выставы, фотаэкспазіцыі. Пастаянна ўкараняюцца новыя формы работы. Напрыклад, сёлета праведзены інтэрактыўная акцыя-сюрпрыз “Падары ўсмешку маме”, дабрачынная акцыя “Берагіня”, удзельнікі якой наведалі і павіншавалі матуль шматдзетных, прыёмных сем’яў, матуль, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, адзінокіх жанчых, якія засталіся без апекі дзяцей.

Важнае месца ў духоўна-маральным выхаванні на аснове праваслаўных традыцый займае далучэнне за ўнікальных святынь Карэліцкай зямлі. Ва ўстанове адукацыі рэалізуецца праект “Дарога да святых вытокаў”. Дзеці разам з бацькамі наведваюць памятныя мясціны раёна, пішуць даследчыя работы. Святар царквы святога Міхаіла агр.Цырын заўсёды жаданы госць ва ўстанове адукацыі. Стала традыцыяй запрашаць яго на дні ведаў, выпускныя вечары, калядныя і велікодныя святы, свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы, на бацькоўскія сходы, пасяджэнні сямейнага клуба “Свет душы” і лекторыяў для бацькоў.






Сям’я мае велізарны выхаваўчы патэнцыял, і мы імкнёмся ўмела яго выкарыстоўваць у арганізацыі адукацыйнага працэсу. Ва ўстанове адукацыі арганізоўваюцца тэматычныя акцыі, круглыя сталы, гадзіны духоўнасці. Стала добрай традыцыяй правядзенне тэматычных бацькоўскіх канферэнцый.

У верасні 2021 года ў рамках праекта “Маё радаслоўнае дрэва” вучні прынялі актыўны ўдзел у напісанні сачыненняў “Хачу, каб мой род працягваў існаваць!”. Хочацца прывесці некаторыя выказванні вучняў : “Сям’я –гэта сур’ёзна і на ўсё жыццё. Галоўнае не тое, колькі чалавек будзе ў нашай сям’і, галоўнае-якія адносіны паміж намі будуць”; “У маім разуменні ідэальная сям’я - гэта калі муж і жонка-адзінае цэлае, калі яны разумець і паважаюць адно аднаго…”; “Так хочацца, каб увогуле не было разбураных сем’яў, разбітых сэрцаў, кінутых дзяцей. А задача бацькоў – выхаваць дзіця сапраўдным чалавекам”. Над гэтымі словамі неабходна задумацца кожнаму. У сучасны час, няма больш важнай задачы, як зацвярджэнне ў грамадстве маральных і грамадзянскіх каштоўнасцей, якія з’яўляюцца асновай яднання нацыі і яе захавання: сям’я як аснова духоўнасці грамадства; дзіця як звышкаштоўнасць, падораная бацькам; бацькоўства і мацярынства як галоўнае прызначэнне чалавека на зямлі; павага да сваіх бацькоў; бескарыслівы клопат пра слабых і безабаронных; любоў да Радзімы і гонар за сваіх продкаў як высокі абавязак кожнага.

Галоўнае ў выхаванні юнага грамадзяніна-дасягненне душэўнага яднання, маральнай сувязі бацькоў з дзіцём. А для гэтага неабходна знаходзіць час для зносін. У наш час, калі паток інфармацыі, якая атрымліваецца дзіцем звонку, цяжка пракантраляваць, набывае найбольшае значэнне бацькоўскі аўтарытэт, таму галоўным фактарам паспяховага выхавання грамадзяніна і патрыёта ў сям'і з'яўляецца грамадзянскія паводзіны, маральная чысціня, справы і ўчынкі дарослых, якія перадаюцца дзіцяці.

Такім чынам,грамадзянска-патрыятычнае выхаванне мае на ўвазе развіццё высокіх маральных каштоўнасцей. Грамадзянін- гэта чалавек, які спалучае ў сабе развітую маральную прававую і палітычную культуру чалавек, які паважае правы і свабоды, традыцыі і культуру іншых людзей, іншых народаў, які праяўляе нацыянальную і рэлігійную памяркоўнасць. Такі чалавек, які, валодаючы ўсімі гэтымі якасцямі, клапоціцца аб росквіце Рэспублікі Беларусь, думае не толькі аб сваёй будучыні, але і пра будучыню другіх людзей старэйшага пакалення. Таму крапатлівыя намаганні бацькоў разам з педагогамі прывядуць да фарміравання высакароднай асобы, якая да самага канца будзе ўсведамляць сваё дачыненне да лёсу Айчыны.

Патрыятызм – важная маральная якасць, якая праяўляецца ў любві да малой радзімы і да краіны ў цэлым. Без патрыятызму чалавек не будзе паважаць Радзіму, грамадства і сваіх блізкіх людзей. Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне – гэта нястомная штодзённая дзейнасць усіх, хто мае дачыненне да фарміравання нацыянальных і маральных каштоўнасцей у маладога пакалення. Ад узроўню грамадзянска-патрыятычнага выхавання дзяцей шмат у чым залежыць станаўленне грамадства і прававой дзяржавы у нашай краіне.

Праз 10-20 гадоў сённяшнія дзеці вырастуць і стануць кіраўнікамі вытворчасці і краіны. Ад таго, як яны будуць выхаваны, залежыць, якой будзе наша краіна, якой будзе наша Радзіма. Таму сёння мы павінны выхоўваць патрыётаў, грамадзян Беларусі з вялікай літары!